Дзякуючы ўпартай працы мазыран ужо да канцы 40-х гадоў эканамічныя паказчыкі па гораду дасягнулі даваеннага ўзроўню.Мазыр стварыў базу для далейшага развіцця прамысловасці, з’яўлення новых галін эканомікі: машынабудавання,электраэнергетыкі, нафтаперапрацоўкі, нафтаразведкі, разведкі і здабычы харчовай солі, лёгкай і харчовай прамысловасці, будаўніцтва і транспарту: аўтамабільнага, воднага, трубаправоднага.

У 50-80-я гады мінулага стагоддзя ўступаюць у строй дзеючых буйнейшыя ў нашай краіне і Еўропе прадпрыемствы, якія змянілі традыцыйную эканамічную структуру Мазаршчыны.

У цяперашні час прамысловасць складае аснову вытворчага патэнцыялу Мазырскага раёна. У Мазырскім раёне дзейнічае каля 30 прамысловых прадпрыемстваў, буйнейшымі з якіх з’яўляюцца акцыянерныя таварыства “Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод”, “Мазырсоль”, “Беларускабель”, “Мазырскі машынабудаўнічы завод”, “Мазырдрэў”, швейная фабрыка “Надэкс”, рэспубліканскія ўнітарныя прадпрыемствы “Мазырскі камбінат па вытворчасці медыцынскай і спіртазмяшальнай прадукцыі “Этанол” і “Мазырскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання”. Больш за 60% выпускаемай прадукцыі пастаўляецца на рынкі блізкага і далёкага замежжа. Таварную структуру экспарту складаюць мінеральныя прадукты, электрычныя машыны і абсталяванне, кабельныя вырабы і адзенне, мэбля і пасцельная бялізна.







Найбольшую ўдзельную вагу ў агульным аб’ёме вытворчасці займае Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, які вырабляе аўтамабільны бензін, дызельнае паліва, мазут, бітум. Больш за 85% прадукцыі завода ідзе на экспарт у краіны блізкага і далёкага замежжа.





Маўырскі раён з’яўляецца адным з буйнейшіх вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі ў Рэспубліке Беларусь. Найбольш буйныя гаспадарк раёну: саўгас-камбінат “Зара ”, сельгаскааператыў “Радзіма”, Слабадскі сельскагаспадарчы кааператыў, Мазырская агароднінная фабрыка, эксперыментальная база “Крынічная”. Асноўнымі відамі дзейнасці сельскагаспадарчых арганізацый Мазырскага раёна з’яўляюцца: у галіне раслінаводства – вытворчасць збожжа, бульбы, агародніны, кармоў; у галіне жывёлагадоўлі – вытворчасць малака, мяса і яек.



Адным з буйнейшых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў раёна, займаючы вядучыя пазіцыі ў рэспубліцы, у апошнія гады з'яўляецца РУП "Саўгас-камбінат"Зара" – шматгаліновае прадпрыемства з высокім узроўнем вытворчасці, выпускам якаснай, канкурэнтаздольнай мясной і малочнай прадукцыі, развітым фірменным гандлем,устойлівым фінансавым станам.

## Літаратура:


1. Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении : Литовское и Белорусское Полесье : репринтное воспроизведение изд. 1882 г. — Мінск : Белорусская Энциклопедия, 1994.

2. Мазыр. 850 год : ут. / пад агульнай рэдакцыяй І. Ф. Штэйнера. — Гомель : Сож, 2005. — Т. 1 : Мазыр: гісторыя і сучаснасць / [Ю. У. Каласоўскі, А. Я. Барсук, С. А. Гайко, З. С. Кур'ян, С. В. Целяпень, К. Д. Маёрава, Т. А. Нікіціна, У. У. Гімбут, С. А. Напрэенка, А. Р. Бобр, І. М. Калбасіна] ; Мазырскі гарадскі выканаўчы камітэт, Установа адукацыі "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт". — 351 с.

3. Мазыршчына: людзі, падзеі, час : матэрыялы II Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Мазыр, 25—26 маяг. / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна" ; рэдкал.: В. С. Болбас [і інш.]. — Мазыр, 2012. — 232 с.

4. Мозырь. Город, который мы любим = Мазыр. Горад, які мы любім = Mozyr. City that we love : фотоальбом / авторы-составители А. Г. Бобр, С. М. Плыткевич. — Минск : РИФТУР, 2009. — 141 с. : ил.

5. Мозырь : историко-экономический очерк / А. Никитин, Е. Зальцман. — Минск : Беларусь, 1973. — 94 с. : ил.